Голас Сенненшчыны



Адукацыя | Главное | Соцыум

Александр Ладыжин возглавляет среднюю школу №1 г.Сенно десять лет

Пятница, 4 окт., 2019 344 admin

Ва ўстанове адукацыі за гэты час шмат чаго змянілася да лепшага. Свой адметны твар набыў унутраны інтэр'ер школы, праведзена істотнае добраўпарадкаванне школьнай тэрыторыі, пастаянна абнаўляецца матэрыяльна-тэхнічная база школы.

II ИГРЫ СТРАН СНГ БЕЛАРУСЬ 2023

12 13 14 15 16 17 ИЮЛЯ
Славянскі базар
XXXII
МЕЖДУНАРОДНЫЙ ФЕСТИВАЛЬ ИСКУССТВ
2023

Читайте газету в PDF





Да работы па штогадовым рамонце вучэбных кабінетаў актыўна далучаюцца бацькі. Сёлета згодна з новымі патрабаваннямі СанПіНа адрамантавана 11 класаў: шпалеры на сценах заменены на фарбу. Два класы цалкам сваімі сіламі адрамантавалі бацькі. На працягу шэрагу гадоў працэнт паступлення выпускнікоў першай сенненскай перавышае сярэднераённы.

— Галоўная задача дырэктара – стварацьспрыяльныя ўмовы для работы педагагічнага калектыву і камфортную абстаноўку для навучання і выхавання дзяцей. А вынікам гэтага павінна стаць высокая якасць адукацыйнага працэсу, — лічыць Аляксандр Ладыжын, які прыйшоў у гарадскую ўстанову адукацыі пасля дырэктарства ў Расненскай і Сінягорскай школах. Дарэчы, у хуткім часе пасля таго, як пакінуў апошнюю, аўтару гэтых радкоў па нейкіх журналісцкіх справах давялося пабываць там. Педагагічны калектыў вельмі шкадаваў, што прыйшлося развітацца з Аляксандрам Іванавічам – умелым кіраўніком і чулым чалавекам.

— Роля дырэктара школы адрозніваецца ад ролі кіраўніка, напрыклад, прамысловага прадпрыемства ці сельгасарганізацыі, — упэўнены Ладыжын. – Дырэктар установы адукацыі павінен не прымушаць падначаленых, а пераконваць у правільнасці прынятых кіраўніцкіх рашэнняў. Наогул, творчыя людзі, а педагогі і ёсць такія, бо кожны ўрок – гэта прадукт творчасці настаўніка, патрабуюць асаблівых падыходаў. Прымусіць тварыць немагчыма, — дзеліцца мой суразмоўца сваімі думкамі. У гэтым пераконвае ўласны вопыт. Настаўнік фізікі Аляксандр Ладыжын выкладаў прадмет шмат гадоў.

На пытанне: “Дырэктар школы больш педагог ці гаспадарнік-адміністратар?” Ладыжын разважліва адказвае:









Видео

— Чалавек, які займае такую пасаду павінен спалучаць у адной асобе і гаспадарніка, і педагога, бо і тыя, і іншыя ўменні і веды патрэбны яму для выканання службовых абавязкаў. Не будзеш гаспадарнікам – прыйдзе ў заняпад матэрыяльная база, не зможаш стаць на пункт гледжання педагогаў – страціш узаемаразуменне з калектывам, а гэта нічога добрага для выхаваўча-адукацыйнага працэсу не абацяе.

Ці любяць дырэктара дзеці? Пытанне крыху бянтэжыць:

— Хочацца спадзявацца, што дзеці мяне паважаюць. А катэгорыя “любяць – не любяць”, на маю думку, крыху іншага парадку...

Што ж самаму дырэктару больш за ўсё не падабаецца ў яго рабоце?

— Не падабаецца караць падначаленых, калі гэта часам здараецца рабіць. Настаўнік павінен ісці да дзяцей з добрым настроем, каб сеяць разумнае, добрае, вечнае. А пасля непрыемнай гутаркі ці нейкага пакарання, які ж можа быць станоўчы і творчы настрой.

...І яшчэ некалькі “штрыхоў да партрэта” дырэктара школы Ладыжына. Аляксандр Іванавіч прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці раёна. Ён дэпутат, з’яўляецца намеснікам старшыні раённага Савета дэпутатаў, уваходзіць у раённы савет апорных пунктаў аховы правапарадку, узначальвае школьную “пярвічку” РГА “Белая Русь”, член прэзідыума раённай арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб’яднання. А ў апошні час у сувязі з маючымі адбыцца ў краіне выбарамі да іншых грамадскіх абавязкаў Аляксандра Ладыжына далучылася работа ў Сенненскай акруговай выбарчай камісіі, членам якой ён з’яўляецца.

Тацяна БУРАКОВА.

Фота аўтара.

15

← Местные органы власти заботятся о создании надлежащих условий для агитации

В прошлую субботу Браслав принимал гостей →

Вам также понравится

Мы в TikTok

Теперь мы в Telegram

Тема недели

ТЕМА НЕДЕЛИ (ПО МАТЕРИАЛАМ БЕЛТА.)

Лента новостей

В аг.Белая Липа горела хозяйственная постройка
Понедельник, 11 сен., 2023

Территориальный центр социального обслуживая



Лукашенко: Беларуси с Россией предрекали гибель, но мы работаем успешно, никакого страха нет

Понедельник, 26 сен., 2022 Комментарии отключены



Для юных сенненцев провели экскурсии сотрудники историко-краеведческого музея

Пятница, 2 апр., 2021 Комментарии отключены



Сенненцев призывают в армию

Вторник, 27 март, 2012 Комментарии отключены

населения Сенненского района предоставляет новую услугу «Персональный ассистент» Пятница, 8 сен., 2023

Сельхозпредприятия района приступили к уборке кукурузы, которая сейчас закладывается в силосные траншеи Пятница, 8 сен., 2023

Фонды Сенненской централизованной библиотечной системы пополнились новыми поступлениями книг Пятница, 8 сен., 2023

Специалисты Сенненской районной инспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды приняли участие в XVII Республиканском экологическом форуме Пятница, 8 сен., 2023

Опрос

Довольны ли Вы качеством оказанных Вам медицинских услуг при посещении учреждений здравоохранения Сенненского района

- ○ Да, доволен
- ○ Скорее да, чем нет
- ○ Скорее нет, чем да
- ○ Нет, не доволен
- ○ Затрудняюсь ответить

Голос

Просмотреть результаты

Рубрики

Выберите рубр

Архив новостей

Выберите мес

Календарь

Сентябрь 2023

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб
				1	2
4	5	6	7	8	9
11	12	13	14	15	16
18	19	20	21	22	23
25	26	27	28	29	30
« Авг					



Баннеры







Курсы валют

Новости Беларуси

Погода в Сенно

Сенно



Малооблачно
2 м/с, южн. 749 мм рт. ст. 47 % вла

День	Вечер	Ночь
		
+23	+19	+11

Gismeteo Прогно

Контакты

Редакция районной газеты «Голос Сенненщины»
Главный редактор Мукомолова Лариса Михайловна

тел.: 8 (02135) 5-53-66
Адрес редакции:
211120, Республика Беларусь, Витебская область,
г. Сенно, улица Чкалова, 4а.
E-mail: rd@senno.by

Статистика





Оплата





Копирайт © 2023 Сенно. Новости Сенно. Голас Сенненшчыны. Все права защищены.